# БЕЛАРУСКІЯ АСВЕТНІКІ І ПІСЬМЕННІКІ
## (фотатэст, IXклас)

| Чый гэта партрэт (фотаздымак)? | | Падказкі |
|---|---|---|
| 1. |  | 1. Яна з’яўляецца роднай унучкай князя УсяславаЧарадзея.<br>2.Заснавала жаночы манастыр недалёка ад Полацка, у Сяльцы, пазней — мужчынскі.<br>3.Першая беларуская мецэнатка, дыпламатка з высокім аўтарытэтам. |
| 2. |  | 1.У літаратуру ён увайшоў як выдатны майстар так званага ўрачыстага царкоўнага красамоўства.<br>2.Нарадзіўся ў сям’і багатых мяшчан, атрымаў выдатную для свайго часу адукацыю.<br>3.З’яўляецца аўтарам слоў-казанняў, некалькіх павучальных аповесцей і прыпавесцей-прытчаў, канонаў, каля 30 вершаў. |
| 3. |  | 1.Шостага жніўня 1517 г. выдаў першую сваю кнігу — «Псалтыр».<br>2.Яго спадчына складаецца з 50 прадмоў і 62 пасляслоўяў да выдадзеных ім кніг Бібліі.<br>3.З’яўляецца пачынальнікам беларускай верша-творчасці. |
| 4. |  | 1.Прадаўжальнік друкарскай справы Ф. Скарыны, які нарадзіўся каля 1530 г.<br>2.Выдаў «Евангелле» каля 1570 г.<br>3.У адным са сваіх твораў ён смуткуе з прычыны таго, што князі, паны і высокапастаўленыя асобы занядбалі родную мову, адносяцца да яе пагардліва, не даюць магчымасці дзецям яе вывучаць |

| Чый гэта партрэт (фотаздымак)? | | Падказкі |
|---|---|---|
| 5. |  | 1.Таленавіты пісьменнік, філосаф, багаслоў, рэфарматар, гуманіст.<br>2.Аўтар «Катэхізіса», які выдадзены ў Нясвіжы ў 1562 г.<br>3.Ён першы пасля Ф. Скарыны пачаў выкарыстоўваць тагачасную беларускую мову ў рэлігійна-палемічным пісьменстве. |
| 6. |  | 1.Суправаджаў Вітэліуса ў трэцім пасольскім падарожжы ў 1518—1523 гадах.<br>2.Выдаў паэму «Песня пра зубра» на радзіме ў 1523 г. пры падтрымцы польскай каралевы Боны, якой і прысвяціў твор.<br>3.Змест паэмы ўзбагачаецца скразнымі метафарамі, асацыяцыямі: зубр — рыцар, важак — князь, аблава — вайна, страла — пяро. |
| 7. |  | 1.Сапраўднае яго імя Самуіл Емяльянавіч Пятроўскі-Сітніяновіч, нарадзіўся ў 1629 г.<br>2.У 1664 г. па запрашэнні цара пераехаў назаўсёды ў Маскву, дзе стаў прыдворным паэтам, займаўся асветніцкай дзейнасцю.<br>3.Пісаў у розных жанрах, пакінуў багатую літаратурную спадчыну, з’яўляецца заснавальнікам сілабічнай сістэмы вершавання ў рускай літаратуры. |
| 8. |  | 1.Пісьменніку давялося пераязджаць у розныя краіны: Расія — Германія — Чэхія — Італія — Аўстрыя — Швейцарыя — Францыя — Турцыя.<br>2.Аўтар паэмы «Пан Тадэвуш». Развіццё сюжэта ў творы перарываецца шматлікімі лірычнымі адступленнямі, рэтраспекцыямі, устаўнымі элементамі.<br>3.Дзеянне паэмы «Гражына» адбываецца ў XIV стагоддзі ў Навагрудку. |

| Чыйгэта партрэт (фотаздымак)? | | Падказкі |
|---|---|---|
| 9. |  | 1.Заснаваў гурток беларуска-польскіх пісьменнікаў, выдаваў штогадовы альманах «Незабудка» (1840—1844), дзе друкаваў свае творы.<br>2.У яго кнізе «Шляхціц Завальня...» спалучаюцца рэальнае і фантастычнае.<br>3.Важнае месца ў творчасці займаюць балады, заснаваныя на беларускім фальклорным матэрыяле |
| 10. |  | 1.Яго называюць «Беларускім Мальерам».<br>2.Некаторыя свае творы падпісваў псеўданімам Навум Прыгаворка.<br>3.Напісаў вершаваныя аповесці «Гапон», «Вечарніцы», «Халімон на каранацыі», «Купала», «Шчароўскія дажынкі». |
| 11. |  | 1.Нарадзіўся 2 лютага 1838 г. у фальварку Мастаўляны Гродзенскага павета. Яго бацька быў уладальнікам маёнтка і невялікай ткацкай фабрыкі.<br>2.Ён выдатна разумеў сілу друкаванага слова, здольнага ўзняць народ на барацьбу, таму выдае першую беларускую газету пад назваю «Мужыцкая праўда», сем нумароў якой выйшлі ў падпольнай друкарні.<br>3.Аўтар адзінага вядомага верша «Марыська чарнаброва, галубка мая». |
| 12. |  | 1.Юрыст па адукацыі, удзельнічаў у паўстанні 1863 г., быў паранены, працаваў адвакатам у Віленскім акруговым судзе.<br>2.У 1891 г. у Кракаве пад псеўданімам Мацей Бурачок выйшаў яго зборнік вершаў «Дудка беларуская», у 1894 г. у Познані — «Смык беларускі» пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава.<br>3.Аўтар паэмы «Кепска будзе!». |

| | Чыйгэта партрэт (фотаздымак)? | Падказкі |
|---|---|---|
| 13. |  | 1.У 1896 г. у Мінску цяжка захварэў, быў паралізаваны, але пераадолеў хваробу і «з двума кійкамі мог хадзіць».<br>2.У 1886 г. дэбютаваў на старонках газеты «Минский листок» вершам на рускай мове «Не ради славы иль расчёта».<br>3.Інжынер па адукацыі, напісаў паэму «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся», якая нагадвае «Песню пра зубра» М. Гусоўскага. |
| 14. |  | 1.Псеўданім, пад якім пісьменніца ўвайшла ў гісторыю беларускай літаратуры, — не адзіны, бо карысталася 28 псеўданімамі і крыптанімамі.<br>2.Сваю першую кнігу назвала «Скрыпка беларуская», якая ўбачыла свет у 1906 г. у г. Жоўкне (каля Львова) у друкарні базыльянскага манастыра дзякуючы вядомаму ўкраінскаму вучонаму Іларыёну Свянціцкаму.<br>3. Выдала таксама «Хрэст на свабоду», «Беларускі лемантар», «Першае чытанне для дзетак беларусаў», «Гасцінец для малых дзяцей». |
| 15. |  | 1.Пісьменнік нарадзіўся 16 студзеня 1869 г. у маёнтку Добасня на Рагачоўшчыне ў сям'і ўпраўляючага.<br>2.Сапраўднае яго прозвішча — Антон Іванавіч Лявіцкі. Стаў заснавальнікам першай Мінскай беларускай кнігарні.<br>3.Першыя арыгінальныя творы былі напісаны на рускай і польскай мовах. У 1892 г. у Радашковічах спрабаваў паставіць спектакль па ўласнай камедыі «Злодзей». Яго алегарычныя апавяданні — лепшая частка літаратурнай спадчыны. |
| 16. |  | 1.Аўтар зборнікаў паэзіі «Жалейка» (1908), «Гусляр» (1910), «Шляхам жыцця» (1913).<br>2.Адзін з пачынальнікаў беларускай драматургіі; стварыўп'есы «Прымакі», «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя». Зрабіў празаічны і вершаваны пераклады «Слова аб палку Ігаравым».<br>3.У 1925 г. прысвоена званне народнага паэта Беларуси |

| Чыйгэта партрэт (фотаздымак)? | | Падказкі |
|---|---|---|
| 17. |  | 1.Жыццёвы шлях звязаны з населенымі пунктамі Акінчыцы, Мікалаеўшчына, Нясвіж, Люсіна, Пінкавічы, Вільня, Мінск...<br>2.Паэт, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай мовы і літаратуры.<br>3.Аўтар паэм «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогіі «На ростанях». |
| 18. |  | 1.Мала жыў.на радзіме, у Беларусі, але стаў вялікім і самабытным нацыянальным паэтам.<br>2.Пражыў усяго 25 гадоў, пахаваны ў Ялце.<br>3.Выдаў адзіны прыжыццёвы зборнік паэзіі «Вянок» у друкарні Марціна Кухты (1913). |
| 19. |  | 1. У гісторыі беларускай літаратуры вядомы як аўтар зборніка «Матчын дар» (1918).<br>2.Выдаў зборнік п’ес для дзяцей «Жывыя казкі» (1920).<br>3.Заключны перыяд сібірскай ссылкі паэт правёў на залатых капальнях. Сум, туга па Беларусі — адзін з асноўных матываў яго лірыкі. |